**ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫШЭЙШАЙ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ**

У Рэспубліцы Беларусь склалася бесперапынная сістэма бібліятэчнай адукацыі наступных чатырох узроўняў: сярэдняя спецыяльная адукацыя − вышэйшая адукацыя (у тым ліку магістратура) − аспірантура (дактарантура) − павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў. Усе гэтыя ўзроўні шчыльна ўзаемазвязаны, узаемадзейнічаюць паміж сабой і на практыцы рэалізуюць прынцып пераемнасці бібліятэчнай адукацыі.

Падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для бібліятэк Беларусі ажыццяўляе факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Падрыхтоўка вядзецца па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” з кваліфікацыяй “бібліятэкар-бібліёграф”, “менеджэр” па наступных напрамках гэтай спецыяльнасці: менеджмент, аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы (АБІС), інфармацыйнае забеспячэнне (па сферах дзейнасці), філалогія (беларуская мова і літаратура), лінгвістыка (англійская мова), кніжны гандаль. У залежнасці ад напрамку спецыяльнасці і спецыялізацыі выпускнікам прысвойваюцца дадатковыя да асноўнай кваліфікацыі: менеджэр, спецыяліст па АБІС, спецыяліст па інфармацыі, выкладчык, перакладчык, таваразнавец (кніжны гандаль). У межах напрамкаў спецыяльнасці студэнты навучаюцца па 9 спецыялізацыях. У сувязі з неабходнасцю рэалізацыі дзяржаўнай праграмы падтрымкі развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва як прыярытэтнага сектара эканомікі з 2011 г. магчыма ажыццяўленне набору на новую спецыялізацыю − “інфармацыйнае забеспячэнне бізнесу і права”.

Набор студэнтаў на спецыяльнасць “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” па дзённай бюджэтнай форме навучання ў БДУ культуры і мастацтваў у 2009 г. склаў 130 чал. (для параўнання: у 1994 г. – 63 чал., у 1974 г. − 250 чал.). На завочную бюджэтную форму навучання штогод у сярэднім прымаюцца 100 чал. Патрэбы ў спецыялістах значна перавышаюць колькасць студэнтаў-выпускнікоў дзённай формы навучання. Апошнія тры гады на кожнага выпускніка па заяўках бібліятэк прыходзілася звыш двух працоўных месцаў. Такім чынам, каб наблізіцца да задавальнення патрэб краіны ў бібліятэкарах, набор на бюджэтную дзённую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форму навучання ў 2010–2015 гг. трэба павялічыць да 200 чал., у тым ліку і на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Але значнае павышэнне набору можа прывесці да зніжэння конкурсу пры паступленні, не будзе садзейнічаць залічэнню ва універсітэт лепшых абітурыентаў. Увогуле, сярэдні конкурс на дзённую форму навучання па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” за апошнія два гады зменшыўся ў залежнасці ад спецыялізацыі. Патлумачыць гэта можна тым, што цяпер пры паступленні ва універсітэт абітурыент у першую чаргу арыентуецца не на конкурс, а на вынікі цэнтралізаванага тэсціравання і прахадны бал па канкрэтных прадметах. Больш таго, колькасць прахадных балаў можна адсачыць па Інтэрнеце ў маштабах рэальнага часу і прыняць рашэнне, на якую спецыяльнасць і ў якую вышэйшую навучальную ўстанову паступаць, каб быць залічаным. У сувязі з гэтым можна сказаць, што бібліятэчную прафесію свядома выбіраюць прафесійна арыентаваныя абітурыенты.

Безумоўна, на конкурс уплываюць зніжэнне сацыяльнага статусу бібліятэчнай прафесіі, дэмаграфічныя праблемы, а таксама і пэўныя недапрацоўкі факультэта ў прафарыентацыйнай рабоце, якая павінна заняць належнае месца сярод напрамкаў дзейнасці ФІДК.

Бібліятэкі разам з установамі адукацыі і мясцовымі органамі ўлады павінны на пастаяннай аснове прагназіраваць патрэбы ў бібліятэчных спецыялістах, фарміраваць прапановы па аптымізацыі структуры і аб’ёмаў іх падрыхтоўкі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў з улікам вынікаў размеркавання і працаўладкавання выпускнікоў, перспектыў развіцця сацыяльна-эканамічнага комплексу краіны і рэгіёнаў.

Вышэйшая бібліятэчная адукацыя інтэгравана з сярэдняй спецыяльнай. Выпускнікі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа (МДБК) імя А.С.Пушкіна паступаюць у БДУ культуры і мастацтваў на скарочаныя дзённую і завочную формы навучання (адпаведна тры і чатыры гады). Паміж універсітэтам і каледжам у 2009 г. заключаны новы дагавор аб вучэбным і навукова-метадычным супрацоўніцтве. З мэтай рэалізацыі рашэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (снежань 2008 г.) у маі 2009 г. заключаны дагавор аб адкрыцці на базе МДБК філіяла БДУ культуры і мастацтваў па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” (завочная форма навучання). Адкрыццё філіяла будзе спрыяць больш рацыянальнай падрыхтоўцы і замацаванню на месцах бібліятэчных кадраў, у першую чаргу для Магілёўскай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гомельскай абласцей, найменш забяспечаных спецыялістамі з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй. БДУ культуры і мастацтваў і МДБК у 2010 г. неабходна завяршыць работу па распрацоўцы і зацвярджэнні новай вучэбна-метадычнай дакументацыі для навучання па сістэме "каледж − універсітэт": вучэбныя планы вышэйшай адукацыі, інтэграваныя з сярэднеспецыяльнай; праграмы вучэбных дысцыплін.

Зацверджаны новы адукацыйны стандарт па спецыяльнасці Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках): вышэйшая адукацыя, першая ступень, тэрмін навучання − 4 гады, які ўжо пачаў укараняцца ў вучэбны працэс з 2008/2009 навучальнага года. У аснову адукацыйнага стандарта ўпершыню пакладзены кампетэнтнасны падыход. У сувязі з гэтым неабходна перапрацаваць існуючыя стандарты (кваліфікацыйныя характарыстыкі) па спецыялізацыях факультэта, прывесці іх у адпаведнасць з новым адукацыйным стандартам і тыпавымі вучэбнымі планамі; неабходна распрацаваць і зацвердзіць адукацыйны стандарт другой ступені вышэйшай адукацыі − магістратуры.

У 2010−2012 гг. мяркуецца завяршыць распрацоўку вучэбна-метадычнай дакументацыі ў адпаведнасці з новымі адукацыйнымі стандартамі: тыпавыя і вучэбныя праграмы, вучэбныя дапаможнікі і тэксты лекцый, заданні па самастойнай рабоце студэнтаў і інш. Надзённай застаецца задача ўкаранення ў вучэбны працэс інавацыйных формаў і метадаў выкладання дысцыплін з выкарыстаннем сучасных педагагічных і інфармацыйных тэхналогій; распрацоўкі электронных сродкаў навучання, электронных вучэбна-метадычных комплексаў; пашырэння доступу студэнтаў і выкладчыкаў да электронных сродкаў навучання.

Стан падрыхтоўкі навуковых кадраў у сферы бібліятэчнай справы сведчыць, што ў БДУ культуры і мастацтваў створаны і дзейнічаюць усе яе элементы: магістратура, аспірантура, дактарантура. Працуе савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. Але на працягу апошніх гадоў адсутнічае ўстойлівы конкурс у магістратуру і аспірантуру. Паўстае задача наладзіць сістэму мэтавай падрыхтоўкі аспірантаў.

Па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія", нягледзячы на значны аб'ём навукова-даследчай работы, за апошнія пяць гадоў, на жаль, не выдадзена ніводнай манаграфіі. Безумоўна, навуковая работа павінна актывізавацца, а яе тэматыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значна больш адлюстроўваць бібліятэчную практыку, пошукі і навуковыя абгрунтаванні інавацыйных падыходаў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Вынікам павінны стаць абарона дысертацый, напісанне манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, энцыклапедый, тэрміналагічных слоўнікаў, інструктыўна-метадычных матэрыялаў і інш. Навуковыя даследаванні, незалежна ад установы іх правядзення, павінны каардынавацца між сабой, у гэтай сувязі плённымі з'яўляюцца сумесныя распрацоўкі найбольш актуальных навуковых тэм, відавочная патрэба ва ўзнаўленні практыкі абмеркавання найбольш актуальных навуковых і навукова-метадычных праблем на пастаянна дзеючым метадалагічным семінары па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве.

Важным кірункам з'яўляецца далучэнне да навуковай работы студэнтаў і магістрантаў факультэта. Навукова-даследчая работа студэнтаў павінна мець сістэмны характар, быць арганічна звязанай з іх прафесійным станаўленнем і разглядацца як першая неабходная ступень падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Дзеля гэтага найперш патрэбны адпаведны ўзровень інтэлектуальнага развіцця студэнтаў, кругагляду, эрудыцыі, здольнасці аператыўна вырашаць пастаўленыя перад імі задачы. Названыя якасці ў першую чаргу фарміруюцца праз актывізацыю дзейнасці студэнцкіх навуковых гурткоў, літаратурных аб'яднанняў, конкурсы студэнцкіх праектаў.

Прафесійная кампетэнтнасць у значнай ступені набываецца ў працэсе бібліятэчнай практыкі. Таму між кірункаў бібліятэчнай адукацыі значная роля належыць дзейнасці па стварэнні на базе буйнейшых бібліятэк вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў. Такія комплексы ўжо працуюць на базе шэрага бібліятэк (напрыклад, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі, Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкі).

З мэтай доўгатэрміновага замацавання выпускнікоў ВНУ, якія накіраваны на працу па размеркаванні, ёсць патрэба ў стварэнні канцэпцыі фарміравання сістэмы адаптацыі маладых спецыялістаў у бібліятэках і арганізацыі комплексу мерапрыемстваў па яе рэалізацыі, азнаямленні з ёй выпускнікоў і патэнцыяльных работадаўцаў, распрацоўцы дзяржаўнай галіновай праграмы "Малады спецыяліст" з адпаведным фінансаваннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Застаецца актуальным удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. Неабходны спецыялізаваныя камп'ютэрныя лабараторыі і адпаведнае праграмнае забеспячэнне па кантролі за самастойнай работай студэнтаў; новыя версіі праграмнага забеспячэння для аўтаматызацыі бібліятэк. У цеснай сувязі з гэтай, пакуль што праблемнай, задачай знаходзіцца вырашэнне пытанняў дыстанцыйнага навучання, хаця яго элементы на ФІДК ужо ўкараняюцца.

З мэтай якасна-выніковага вучэбнага працэсу неабходна пастаянна пашыраць і абнаўляць інфармацыйна-рэсурснае забеспячэнне: даўкамплектаваць спецыяльныя кафедры ФІДК галіновымі рэфератыўнымі журналамі і бібліяграфічнымі выданнямі Беларусі, Расіі, іншых краін (у тым ліку на CD-ROM); табліцамі класіфікацыі (УДК, ББК), новымі стандартамі сістэмы інфармацыйна-бібліяграфічнай і бібліятэчнай дзейнасці (СІБІД), інфармацыйна-пошукавымі тэзаўрусамі і інш. у колькасці, якая забяспечыць паўнавартаснае правядзенне лабараторных заняткаў.

Павінна быць створана і ўведзена ў дзейнасць сістэма менеджменту якасці падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у святле патрабаванняў стандарта ISO 9001, якая грунтуецца на наступных асноўных прынцыпах: арыентацыя на спажыўца адукацыйных паслуг; лідэрства кіраўніка; далучэнне персаналу; працэсны падыход; сістэмны падыход да менеджменту; пастаяннае паляпшэнне; прыняцце рашэнняў, заснаваных на фактах; узаемавыгадныя адносіны з партнёрамі, работадаўцамі і іншымі суб'ектамі на рынку адукацыйных паслуг.

Патрабуецца паступовая ратацыя кадраў прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта, актыўнае далучэнне да работы на кафедрах выпускнікоў аспірантуры і магістратуры, дактароў і кандыдатаў навук, іншых высокакваліфікаваных спецыялістаў інфармацыйна-дакументнай сферы.

**М.А.Яцэвіч,** *дэкан факультэта*
*інфармацыйна-дакументных камунікацый*
*Беларускага дзяржаўнага універсітэта*
*культуры і мастацтваў,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ